# З'яднанасць творчых сіл

**Выстаўка «Карункавая гісторыя» творчага тандэму Генадзя і Святланы Вяль працуе ў галерэі «Атрыум» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Брэсцкія мастакі прадставілі экслібрысы, графіку, выцінанкі і габелены. Большасць даволі розных работ вельмі цесна звязана з літаратурай, культурай і нацыянальнымі традыцыямі. Убачыць творы можна да 15 лістапада.**

Член Беларускага саюза мастакоў, мастак-графік, педагог Генадзь Вяль — аўтар шматпланавы. Сярод тэхнік, у якіх ён працуе, — афорт, акватынта, сухая igла, акварэль. Ведаюць яго не ў апошнюю чаргу як майстра экслібрыса. Арганізатары выстаўкі нагадваюць, што больш за трыццаць гадоў гравюры Генадзя Вяля прадстаўляюць мастацтва беларускага эстампа на рэспубліканскіх і міжнародных графічных выстаўках і конкурсах.

Графіка мастака даволі вытанчаная, змрочная і рэзкая. Ён аб'ядноўвае розныя плыні мастацтва, ствараючы арыгінальныя выявы, якія часам здольны ўстрывожыць, збянтэжыць. Генадзь Вяль імкнецца не ісці пратаптаным шляхам, паказвае прыклад, як пра тыя ж міфы і традыцыі можна гаварыць на ўласнай мове. Выклікаюць цікавасць у першую чаргу экслібрысы: Алега Судлянкова, Алеся Мемуса, Леаніда Анцімонава, Сяргея Брадовіча… Відавочныя і карпатлівая праца, і індывідуальны падыход аўтара да кожнага з герояў.

Член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, дырэктар Брэсцкай дзіцячай школы выяўленчых мастацтваў імя А. А. Алонцава Святлана Вяль займаецца ручным мастацкім ткацтвам і выцінанкай. Яе работы часта аздабляюць выстаўкі, на якіх прадстаўляюць народную творчасць. На працягу многіх гадоў мастачка спрабавала розныя тэхнікі, эксперыментавала з усялякімі арнаментамі, аднак усё роўна вярнулася да свайго стылю, якому ўласцівыя зварот да беларускага ўзору, карункавыя акенцы, рамачкі, вітражная шматколернасць. Як правіла, работы мастачкі даволі вялікія і аб'ёмныя.



*Генадзь Вяль «E. L. G. V.», 2022 г.*



*Святлана Вяль «Палёт закаханай стракозы», 2021 г.*

Галоўнымі героямі сталі кветкі, птушкі, анёлы — своеасаблівыя жыхары ўласнага райскага саду Святланы Вяль. Яе выцінанка ў меру яркая, выбраныя колеры, як кажуць, хваляць адзін аднаго. Між тым асноўная характарыстыка выразкі з паперы гэтага аўтара — шчыльнасць малюнка без абцяжарвання. Нішто не перашкаджае арнаменту быць выразным і прыкметным. Габелен Святланы Вяль вельмі адрозніваецца ад яе выцінанкі: манерай апавядання, настроем, натуральна, самой кампазіцыяй. Больш стрыманыя, меланхалічныя, прасякнутыя ледзь улоўным смуткам, гэтыя работы ўспрымаюцца нечым дастаткова іншаземным, халодным.

**Яўгенія ШЫЦЬКА**